■ Спажывец

ЗА ПАРУШЭННІ Ў СФЕРЫ ГАНДЛЮ ШТРАФЫ ПАВЯЛІЧАЦЦА?

Летась, у ліпені, пры Міністэрстве гандлю было створана ўпраўленне кантролю спажывецкага рынку, ці прасцей — гандлёвая інспекцыя. Яна ажыццяўляе кантроль за выкананнем арганізацыямі і грамадзянамі, у тым ліку ІП, заканадаўства аб гандлі (у прыватнасці, патрабаванняў да якасці тавараў, якія рэалізуюцца), назірае за належным выкананнем суб'ектамі гаспадарання работ і аказаннем паслуг. Днямі аб выніках і перспектывах працы гандлёвай інспекцыі ішла размова падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА. На пытанні адказваў начальнік упраўлення кантролю спажывецкага рынку — гандлёвай інспекцыі Валяр'ян Бяспалы. «Звязда» друкуе найбольш цікавыя адказы.

Аб пакаранні

«Памеры штрафных санкцый, устаноўленых за большасць парушэнняў, што выявіліся падчас праверак і маніторынгаў, нізкія, — канстатаваў Валяр'ян Бяспалы. — Пры гэтым суды ўжываюць, як правіла, мінімальныя санкцыі». На яго думку, адсутнасць аднастайнага падыходу пры разглядзе спраў і прыцягненне да мінімальнай адказнасці вінаватых службовых і юрыдычных асоб не дазваляе забяспечыць належны парадак у сферах гандлю і паслуг, скараціць колькасць парушэнняў. «У некаторых выпадках суб'екту прадпрымальніцкай дзейнасці больш выгадна заплаціць за рэалізацыю пратэрмінаваных тавараў штраф, чым спісваць прадукцыю, кошт якой істотна перавышае памер штрафных санкцый. У сувязі з гэтым Міністэрства гандлю 13 снежня 2013 года звярнулася ў Вярхоўны Суд з просьбай рэкамендаваць судам пры разглядзе пытанняў аб прыцягненні да адказнасці за падобныя парушэнні прымяняць больш істотныя штрафныя санкцыі, сувымерныя з характарам здзейсненых адміністрацыйных правапарушэнняў, ступеню віны парушальнікаў, а таксама цяжарам магчымых наступстваў». Акрамя таго, Мінгандаль рыхтуе прапановы па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у асобныя нарматыўныя прававыя акты, накіраваныя на ўзмацненне адказнасці за асобныя правапарушэнні ў сферы гандлю, грамадскага харчавання, бытавога абслугоўвання насельніцтва і абароны правоў спажыўцоў.

Праверкі напярэдадні чэмпіянату

«У адпаведнасці з заканадаўствам, рэжым праверкі аб'ектаў, якія будуць абслугоўваць гасцей і жыхароў Мінска ў перыяд правядзення ЧС, павінен супадаць з рэжымам іх працы, — заявіў Валяр'ян Бяспалы. — За апошні час праведзены праверкі аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання, якія працуюць у Нацыянальным аэрапорце «Мінск» і на сталічным чыгуначным вакзале. Па выніках праверак, на жаль, было ўстаноўлена шмат парушэнняў. У прыватнасці, высветлілася, што практычна ў кожным другім аб'екце гандлю рэалізуецца пратэрмінаваны тавар. Адпаведна, будуць узмоцнены патрабаванні да суб'ектаў гаспадарання, у першую чаргу тых, хто ажыццяўляе сваю дзейнасць на тэрыторыі аэрапорта і вакзала».

Дастаткова адной скаргі

Колькі павінна паступіць скаргаў на канкрэтную краму, каб супрацоўнікі інспекцыі выехалі на месца? На гэтае пытанне адказаў так: «У гэтым выпадку колькасць не мае значэння. Мы правяраем адпаведнасць скаргі і прымаем рашэнне па праверцы. Пакупніку, чые правы былі парушаны, дастаткова патэлефанаваць адзін раз, каб мы былі гатовы праверыць любы аб'ект. На жаль, за адзін раз адрэагаваць на ўсе званкі мы не можам. У штаце на ўсю краіну толькі 34 чалавекі, тады як колькасць гандлёвых аб'ектаў і грамадскага харчавання перавышае 72 тысячы. У той жа час колькасць прадпрымальнікаў, якія займаюцца рэалізацыяй тавару і аказаннем паслуг, — 120 тысяч. Разам з тым, усе званкі, якія паступаюць да нас на гарачую лінію, бяром пад кантроль».

Дарэчы, Валяр'ян Бяспалы не выключыў, што для спрашчэння зваротаў грамадзян можа быць створаны кароткі нумар «гарачай лініі». «Аднак і дзеючы нумар у Мінску зусім не складаны, яго лёгка запомніць — (017) 200-92-02, — падкрэсліў кіраўнік гандлёвай інспекцыі. — Да нас пакуль не паступала скаргаў ад насельніцтва на тое, што туды нельга ці складана дазваніцца. Тэлефон дзейнічае ў працоўны час, аўтаадказчыка там няма, зносіны ажыццяўляюцца напрамую з грамадзянінам. Калі людзі сутыкаюцца з праблемай увечары, калі вяртаюцца з працы, або ў выхадныя дні, можна патэлефанаваць па гэтым нумары пазней».

Гульні з цэнамі

«Парадак афармлення цэннікаў і іх наяўнасці з'яўляецца адным з фактараў, які мы пры кожнай інспекцыі правяраем у суб'екта гаспадарання. Вядома, ёсць мноства нараканняў на неадпаведнасць цэн па многіх аб'ектах. Але мы прымаем захады, у тым ліку складаем дакументы для прыцягнення юрыдычных асоб і суб'ектаў гаспадарання да адказнасці. Калі сам пакупнік выявіў неадпаведнасць цаны ў гандлёвай зале і пры разліку, несумненна, ён мае права запатрабаваць правільнага разліку ў любога суб'екта і вяртання тавару. Заўсёды трэба звяртацца да кіраўніка аб'екта, — раіць спецыяліст, — які павінен гэтую сітуацыю разгледзець і вырашыць на карысць пакупніка, калі факт парушэння ўстаноўлены. Трэба арыентавацца на кошт, які пазначаны на цэнніках у гандлёвых залах. Калі ж у чэку кошт вышэй, пакупнік можа запатрабаваць вярнуць яму розніцу».

На інтэрнэт-краму таксама можна паскардзіцца

«Кантралюе працу інтэрнэт-крам, якіх у Беларусі налічваецца больш за 6,5 тысячы, не толькі гандлёвая інспекцыя, але і ў цэлым Міністэрства гандлю, — сказаў Валяр'ян Бяспалы. — За мінулы год праверкі прайшлі больш чым у 250 інтэрнэт-крамах. Устаноўлена мноства парушэнняў пры арганізацыі іх працы. Сярод найбольш частых — адсутнасць указання кошту на тавар або ўказанне не ў беларускіх рублях, а таксама непрадастаўленне чэка. Калі пакупнік сутыкаецца з праблемамі ў працы з інтэрнэт-крамамі, яму варта звяртацца або ў Міністэрства гандлю, або ў таварыства па абароне правоў спажыўцоў».

Падрыхтаваў Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

■ Жыллё

КОЖНЫ ДРУГІ БУДАВАЎСЯ ЗА СВАЕ ГРОШЫ

Летась на будаўніцтва жылля ў нашай краіне было выкарыстана 32,9 трлн рублёў інвестыцый у асноўны капітал, што складае 16,2% да агульнага аб'ёму інвестыцый і 124,5% да ўзроўню 2012 года. Пераважнымі крыніцамі фінансавання жыллёвага будаўніцтва з'яўляюцца ўласныя сродкі насельніцтва (51,1% інвестыцый) і крэдыты (пазыкі) банкаў (31,1%), паведамілі рэдакцыі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Спецыялісты падлічылі, што арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці за год пабудавана 63,3 тыс. новых кватэр (у 2012 годзе — 57,2 тыс.). А ўсяго ўведзена ў эксплуатацыю 5 273,8 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля, што складае 81,1% да прадугледжанага задання на год і 117,6% да ўзроўню 2012 года.

Больш за ўсё жыллёвых «квадратаў» было ўведзена ў Мінскай вобласці (1414,8 тыс.), потым ідзе сталіца нашай краіны (1166,6 тыс.), Брэсцкая вобласць (792,4 тыс.), Гродзенская (654,9 тыс.), Гомельская (521,0 тыс.), Магілёўская (363,9 тыс.) і Віцебская (360,2 тыс.).

Для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 2 825,6 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы, або 53,6% ад агульнага аб'ёму ўведзенага жылля. Статыстыка выявіла, што для «чаргавікоў з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі пабудавана 2 483,6 тысячы квадратных метраў, у шматкватэрных жылых дамах у гарадах — 1 894 тысячы жыллёвых «квадратаў». На вёсцы летась уведзена ў эксплуатацыю 1 404,2 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля, або 26,6% ад агульнага ўводу па рэспубліцы (у 2012 годзе — 21,5%). Асобна адзначу, што па сельскім жыллёвым будаўніцтве лідарства трымае Мінская вобласць, дзе летась было пабудавана ажно 1124 тысячы квадратных метраў жылля. Ад сябе агучу яшчэ адну новую тэндэнцыю: упершыню за апошнія гады фінансаванне гэтага сектара ажыццяўлялася пераважна за ўласныя сродкі людзей (51,1%). Раней доля банкаўскіх крэдытаў, у тым ліку льготных, у агульным аб'ёме фінансавання гэтай сферы дасягала 70-80%.

Сяргей КУРКАЧ

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

«СЯРОД АКЦЫЯНЕРАЎ ТАВАРЫСТВА НЯМА»

Чарговы зварот на «гарачую лінію» нашага выдання паступіў з вёскі Сінкевічы Лунінецкага раёна. Паводле слоў заяўніка, яны з жонкай абмянялі чэкі «Маёмасць» на акцыі «Беларускалія». Пытанне датычыла выплаты дывідэндаў. Як распавёў далей вясковец, за два апошнія гады яны зусім мізэрныя: 1050 — 1300 рублёў. «Я нават на пошту не хаджу па гэтыя грошы. Чаму дывідэнды такія малыя?»

Забягаючы наперад, зазначым, што заяўнік памыліўся з назвай прадпрыемства, а пра акцыі ўвогуле нешта наблытаў. З гэтай прычыны рэдакцыя не згадвае яго імя. Тым не менш мы спрабавалі дапамагчы чалавеку разабрацца ў сітуацыі: неаднойчы тэлефанавалі на «Беларускалій», потым накіравалі туды пісьмовы запыт. Вось што ў выніку, абапіраючыся на афіцыйны адказ з прадпрыемства, можам паведаміць заяўніку.

У адпаведнасці з п.1.1 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 10.11.2008 г. № 605 (у рэдакцыі Указаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25.06.2010 г. № 331), пры пераўтварэнні рэспубліканскіх унітарных прадпрыемстваў, згодна з дадаткам, у адкрытыя акцыянерныя таварыствы ў адпаведнасці з планам прыватызацыі аб'ектаў, якія знаходзяцца ў рэспубліканскай уласнасці, на 2008—2010 гады, належныя Рэспубліцы Беларусь акцыі вышэйзгаданых таварыстваў не падлягаюць продажу на льготных умовах за грашовыя сродкі і абмену на імянныя прыватызацыйныя чэкі «Маёмасць».

«Адпаведна, грамадзянін не мог абмяняць свае імянныя прыватызацыйныя чэкі «Маёмасць» на акцыі ААТ «Беларускалій». Сёння 100 працэнтаў акцый таварыства знаходзяцца ва ўласнасці дзяржавы ў асобе Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь, а значыць, фізічных асоб сярод акцыянераў няма».

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Конкурс

Хто самы прыгожы за прылаўкам?

У сталіцы ўпершыню пройдзе Мінскі гарадскі конкурс прыгажосці і жаноцкасці «Міс гандаль-2014».

Яго арганізатарам выступае галоўнае ўпраўленне спажывецкага рынку Мінгарвыканкама. Мерапрыемства плануецца ў мэтах «развіцця эстэтычнай і духоўнай культуры, рэалізацыі творчага патэнцыялу, матывацыі актыўнай жыццёвай пазіцыі ў моладзі, развіцця карпаратыўнай культуры ў арганізацыях галіны».

Чакаецца, што ў спаборніцтве возьмуць удзел прадстаўніцы прыгожага полу амаль 60 гандлёвых арганізацый Мінска. Адборачныя этапы конкурсу пройдуць на прадпрыемствах да канца месяца, фінал з абвяшчэннем пераможцаў і цырымоніяй ўзнагароджвання адбудзецца напярэдадні Дня жанчын — 4 сакавіка.

Сяргей РАСОЛЬКА

■ Віртуальныя грошы

ПЛАЧУ ЗА ЎСЁ!

У трымальнікаў картак найбуйнейшага банка краіны, якія карыстаюцца паслугай «Аўтааплата», сёння ўжо знікла неабходнасць пастаянна кантраляваць своечасовасць папаўнення балансу асабовых і абаненцкіх рахункаў, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе Беларусбанка. Неабходны плацеж здзяйсняецца ў аўтаматычным рэжыме — патрабаваная сума грашовых сродкаў спісваецца з рахунку, а трымальніку карткі прыходзіць апавяшчэнне аб праведзенай аперацыі.

Нагадаю, што да апошняга часу ў кліентаў банка існавала толькі магчымасць аўтаматычнай аплаты паслуг мабільнай сувязі (МТС, life і Velcom), стацыянарнага тэлефона па лініі прадпрыемства «Белтэлекам», камунальных плацяжоў (у тым ліку за электраэнергію і газазабеспячэнне), інтэрнэт-правайдараў (у т. л. byfly, Космас ТБ, Атлант Тэлекам) і іншых арганізацый — удзельнікаў сістэмы «Разлік».

Зарэгістраваць паслугу «Аўтааплата» можна ў любым інфакіёску Беларусбанка, а для аўтааплаты паслуг аператараў мабільнай сувязі — таксама з выкарыстаннем паслугі «М-банкінг».

Сяргей КУРКАЧ